асабІста

ПРЭЗЫДЭНТУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
АЛЕКСАНДРУ РЫГОРАВІЧУ
ЛУКАШЭНКУ

АД БЕЛРУСА ІВАНА МІРОНЧЫКА
г.Мінск
вул.Прытыцкага, дом.№ 38,кв.19
тэл.255-13-55

Modern History Archives
Archiwum Najnowszej Historyi
Fond 9М64(3а)

Гэты ліст пішa Вам грамадзянін Рэспублікі Беларусь,карэнны,этнічны беларус,які жыў пад уладай польскіх,бальшэвіцка-расейскіх і нямецкіх акупантаў.Значыць,я ужо стары чалавек.Разніца паміж усімі нашымі "вызваліцелямі" - акупантамі і каланізатарамі была у колькасці,цяжкасці і якасці злачынстваў,чыніўшыхся беларускаму народу.Найменьш злачыннымі былі палякі,а найбольш - немцы у вайну.Бальшэвіцка-расейскія злачынцы займалі сярэдняе месца.Дзякуй Богу і НАТА!,што Вы,Александра Рыгоравіч,пражылі 40 гадоў без вайны,што Вы не ведаеце яе жахаў.Каб не НАТА,камуністы,нядобрай памяці,Савецкага Саюза распалілі бы пажар сусветнай пралетарскай рэвалюцыі.Свае чырвоныя галавешкі імі былі кінуты у дамы многіх народаў.

Каля 30 гадоў Вы выхоўваліся на камуністычнай ідэалогіі,якая была прыстасавана к інтэрэсам расійскага імперыялізма.Вам удоўблівалі пра інтэрнацыяналізм,дружбу народаў,што да Расеі усе далучыліся дабрахвотна і стварылі Савецкі Саюз.Яскравы прыклад,як "дадрахвотна" далучаліся ёсць і цяпер - Чэчня.Каб заваяваць малы народ,імперыялісты заўсёды находзілі для эмана грамадскай думкі апраўданні,каб ніякі канстытуцыйны суд народаў не падкапаўся.Але ж злачынства ёсць злачынства,яго утаіць немагчыма ніякімі аргументамі,прыдуманамі назвамі тыпа "Інтэрнацыяналістаў". Гісторыю,як вядома,схаваць немагчыма.Напомню Вам,як гісторыку што за апошнія 500 гадоў,за інтэрэсы Расеі Беларусь(старажытная Літва) траціла ад чвэрці да паловы свайго насельніцтва,руйнавалася,грабілася. Вось гэтыя даты: Лівонская вайна(1558-1583),вайна Аляксея Міхайлавіча "цішэйшага"(1654-1667),"Паўночная вайна"(1700-1721),Французска-Расейская вайна(1912),Першая(1914-20) і Другая(1941-45) сусветныя войны. А былі яшчэ шматлікія і другія дзесяткі войнаў Расеі супраць старажытнай Беларусі(Літвы),3 раздзелы Рэчы Паспалітай,бальшэвіцкі тэрор,паўстанні супраць расійскіх і бальшэвіцкіх "вызваліцеляў",якія унеслі міліёны жыццяў беларусаў. Цяперашняя Беларусь недалічваіць добрых 50 міліёнаў чалавек

Вот так "Мы беларусы з братняю Руссю разам шукалі к шчасцю дарог". Рускімі штыхамі быў создан і "Саюз нерушимы рэспублік свабодных"

Беларусы вякамі паланізаваліся,русіфікаваліся,закрываліся беларускія школы,універсытэты,забаранялася родная беларуская мова і ніхто не пытаўся із акупантаў і каланізатараў згоды на гэта злачынства у нас. Для гэтай чорнай справы знаходзіліся і мясцовыя "Юды Эскарыёты".

vytoki.net

СавецкI Саюз I распаўся(нIхто яго не разваліваў) перш за усё таму, што палітыка камуністычнай Расеі была псеўдаінтэрнацыянальнай : усе нярускія народы,асабліва беларусы, інтэнсіўна каланізаваліся чужынцамі і русіфікаваліся,што называлася пераутварэннем у адзіны савецкі народ.У Латвіі,напрыклад,каланізацыя краіны дасягнула да 50% ад колькасці усяго насельніцтва,у Мінску - 30%.Чужынцы - "інтэрнацыяналісты" сталі выцясняць із хаты самага гаспадара.Людзі вымушаны былі шукаць лепшай долі на агромных азіяцкіх прасторах,на Захад не пускалі.Беларуссю фактычна кіравалі чужынцы і Масква цераз мясцовых марыянетак.

Тактыка імперыялістаў,акупантаў і каланізатараў агульнавядомая. Завязаўшы народ пад флагам дабрачыннасці(праваслаўя,інтэрнацыяналізма,вызвалення і г.д.),далей яны насаджаюць сваю адміністрацыю,каланізуюць край,уводзяць свае парадкі,законы,дэнацыяналізіруюць "дабрахвотна" карэнная насельніцтва,а то і вынішчаюць яго.Наканец,пішуць дэкларацыі аб "правах чалавека", "аб абароне законных праваў нацыянальных меншасцяў. Абжыўшыся,яны патрабуюць каб і іх мова была дзяржаўнай, калі гэта дзяржава фармальна лічыцца незалежнай,суверэннай.Яны - чужынцы плююць на яго незалежнасць,хаця і лічацца грамадзянамі гэтай дзяржавы,вядуць сябе пахабна,здзекліва,ведаючы,што за іх спіной стаіць больш магутная іх запраўдная бацькаўшчына-дзяржава,напрыклад,Расея,нацыянал-шавеністы якой так заботліва клапоцяцца аб інтэрэсах суайчыннікаў - падкінутых у чужоя гняздо кукушкіных дзецях,але дамоў не забіраюць: *їм трэба мадраўдная 5-я калона.*

Вось чаму,у Рэспубліцы Беларусь не можа быць дзяржаўнай мовай ніякая другая мова,а толька беларуская,якой на дзяржаўнай службе павінны карыстацца і усе нацыянальныя меншасці,раз яны вырашылі жыць у нашым беларускім доме з пазвалення гаспадара.Гэта няпраўда,што на беларускай мове нельга выказаць нічога значнага.Наша мова адна із самых развітых моў у Свеце,вельмі багатая і беларуская літэратура,на ей напісаны сусветна вядомыя працы,творы,энцыклапедыі.Яна прыгодна для усіх навук. Яна выжыла і развівалася,нягледзячы на антыбеларускі моўны тэрор і генацыд.На роднай мове з садзікаў павінны вучыцца нашы дзеці,абавязкова . Увядзенне у Беларусі другой дзяржаўнай мовай рускай загубіць беларускую нацыю і яе Адраджэнне,саму мову,справацыруе міжнацыянальную непрыязнь із-за прыніжэннасці беларускай нацыі,пачуцця уласнай"непаўнацэннасці",бо такога пахабнага навязывання з-русіфікаванай нацыі другой дзяржаўнай мовы рускай няма нігдзе у свеце.Нацыянальна свядомымі беларусамі а іх ужо сотні тысяч,гэты акт расцэніваецца як этап к ліквідацыі сваей незалежнасці і навогул беларускага этнаса.Канешне,за свае паўнацэннае існаванне беларусы будуць змагацца,як змагаўся бы пакрыўджаны і любы другі народ.

vytoki.net

Пры цяперашняй сIтуацыI у БеларусI,калI большасць насельнIцтва яшчэ зрусIфIкавана,калI у нас пражывае 20% чужынцаў(нац.меншасцяў),калI краIна фактычна акупавана расейскай армIяй ды I "беларуская" армIя фактычна яўляецца расейскай,калI краIну наведываюць мIлIёны расIйскI дзякоў,рэферэндум скарэй за усе пройдзе на карысць акупантаў I каланIзатарау,але з вынIкаў яго з задавальненьнем будуць хIхIкаць I смяяцца,як I з самаго "бацькI" нацыI,IнIцыятара рэферэндума.А у памяцI беларусаў,гIсторыI,яго, ён застанецца як нацыянальная здрада прэзIдэнта,якI за незалежнасць свайго народа не ваяваў,кроў не пралIваў,не сядзеў у турмах,не галадаў,не знаходзIуся у псIхушках,а беларускую нацыю I дзяржаву загубIў,прадаў РасеI.Герастратава гэта будзе слава.

Самыя акрывавуленыя,афарбованыя нявIноўнай крывей дзяржаўныя сIмвалы гэта "красное знамя" камунIстаў I дзяржаўныя сIмвалы РасеI.Гэта пад нIмI чынIлIся расправы над мIлIёнамI невIноўных людзей,вялIсI каланIяльныя войны.Пад расIйскIмI дзяржаўнымI сIмваламI уласаўцы ваявалI на баку нямецкIх фашыстаў.Але чамусцI бальшэвIкI,акупанты I каланIзатары маўчаць наконт Iх адмены I замены новымI,а вот нашы гIстарычныя,старажытна-дзяржаўныя Iх непакояць.Гэта не прыхаць,а яны не хочаць каб яны напамIналI беларусам,што калIсцI у Iх была свая магутная дзяржава.Гэта нашы беларускIя,а не цяперашняй ЛIтвы - старажытнай ЖамойцI,уваходзIушай у склад ВялIкага Княства ЛIтоўскага,Жамойцкага I Рускаг Гэта не мы беларусы прысвоIлI сабе"жамойцкую пагоню"(цяперашняй ЛIтвы а цяперашняя ЛIтва прысвоIла сабе назоў нашай старажытнай дзяржавы,герб ды у прыдачу атрымала ад бацькI СталIна I яго расейскIх памагатых старажытную нашу беларускую сталIцу ВIльню з навакольным вялIкI краем Цяперашняя наша "Пагоня" адрознIваецца ад цяперашняй лIтоўскай "Пагон так,як адрознIваюцца гербы-арлы ЗША,ГерманII,Польшчы,РасеI.Як вядома,у РасеI герб не свой,а ВIзантIйскI.Так што,зра Бразаўскас абIжаецца,што беларусы прысвоIлI Iх герб.Ён проста знаў з кIм мае справу.ЯкI больш прэзыдэнт на свеце скажа:"Забяры ты наш герб сабе..."?

Не таго мы беларусы чакалI ад свайго прэзыдэнта.ПапулIст I Валэнса,але як ён адстоIвае Iнтэрэсы сваей нацыI! Задуманы ВамI,Александр РыгоравIч,рэферэндум вельмI ускладнIць усю абстаноўку у БеларусI.Я,напрыклад нIколI не адкажуся ад сваIх мовы,старажытных дзяржауных сIмвалау.К таму жа,задумка Ваша наконт рэферэндума супярэчыць КанстытуцыI,як I таталIтарызацыя сродкаў масавай IнфармацыI,адхIленне ад пасады галоўнага рэдактара НГ IосIфа ПаўлавIча СярэдзIча,хаця Вы на увесь Свет заяўляеце,што можыце знайсцI фармулIроўку любога закона каб не падкапауся нIякI канстытуцыйны суд.Што ж гэта за законы I што ж гэта за прэзыдэнт,якI можа абыйцI любы закон,нялюбIць сваей мовы,дзяржавы,патрыётау Айчыны,Бацькаушчыны!?

vytoki.net

Складываецца такое уражанне,што у Рэспублiцы Беларусь неякi прэзыдэнтска-таталiтарны рэжым.Ну,а калi дзеткi вучацца на чужой мове,на патрыетаў ганенне,граніцы з Расеяй і Украінай раскрыты,як вароты у хлеў:захадзіце свiннi,хто хоча;саветнiкi-чужыя чорныя палкоўнiкi,ва урадзе расейскiя лобi,расейская армiя за наш кошт утрымлiваецца на нашай тэрыторыi,а "беларускай"армiяй камандываюць рускiя афiцэры,калi нашымi "Суэцкiмi каналамi" можна сказаць дарма карыстаюцца расiйцы, калi на 85% мы залежны эканамiчна а Расеi.Дык гдзе ж тут наш суверэнiтэт.Мы жа каланiяльная,ці марыянетачная расейская дзяржава.А чаму ж мы не можам быць такiмi незалежнымi,як прыбалтыйскiя краiны,Чэхiя,Славакiя,Данiя,Грэцыя,Фiндляндыя i гд. У чым справа.Ці Бог спецыяльна нас падкiнуў пад Расею на здзек? А можа справа у чым iншым?..

Вот што,шаноўны Прэзыдэнт,набалела на душэ у беларуса.Вы яшчэ малады.Вельмi раў бы Вам дасканала авалодаць роднай беларускай мовай, вывучыць запраўдную нашу гiсторыю,кожны дзень чытаць беларускую лiтэратуру,заусёды памятаць,што Вы сын беларускай нацыi,што Ваша Прэзыдэнтская Мiсiя падняць свой народ з калень на ногi,прабудзiць у яго нацыянальную свядомасць,годнасць,патрыятызм.

Прабачце,калi што я тут напiсаў не па-Вашаму.

Абiдна нейк за свой народ,за дзяржаву i яе Прэзыдэнта.

Жадаю Вам добрага здароўя i пленнай працы
на карысць беларускага народа.

28.03.1995г.

vytoki.net